С.А.Валахановіч, *дацэнт*

# СПОСАБЫ АКТЫВІЗАЦЫІ ПАЗНАВАЛЬНЫХ ІНТАРЭСАЎ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ САМАСТОЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Пазнавальны інтарэс студэнтаў як устойлівая рыса характару, што фарміруецца ў працэсе актыўнага, праблемнага навучання, праяўляецца толькі ў тым выпадку, калі студэнт умее працаваць самастойна.

Прычыны цяжкасцей у арганізацыі самастойнай работы, як паказвае апытанне студэнтаў, многія з іх бачаць у няўменнях сінтэзаваць веды, атрыманыя з розных крыніц, планаваць самастойную работу, вызначаць галоўную мэту заняткаў.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Акрамя таго, названыя прычыны дапаўняюцца адсутнасцю волі і працавітасці.

Далучыць студэнтаў да самастойнай пошукава-пазнавальнай дзейнасці магчыма пры выкарыстанні праблемных сітуацый у педагагічным працэсе, дзе педагог ажыццяўляе:

— пошук і пастаноўку вучэбнай праблемы;

— прапануе сітуацыю, якая ўтрымлівае праблемныя пытанні;

— стварае сітуацыю інтэлектуальнага напружання.

У працэсе навучання неабходна выкарыстоўваць разнастайныя займальныя формы навучання, дзе ўтрымліваюцца элементы назіральнасці, цікавасці, эмацыяльнасці, якія выклікаюць імкненне пераадольваць цяжкасці і патрабуюць самастойнасці.

Часткова-пошукавая дзейнасць і праблемнае выкладанне — гэта тыя формы, за якія адказвае педагог, а самастойная даследчая работа ажыццяўляецца студэнтам у працэсе аналізу і адбору асноўнага матэрыялу, выбару асноўных праблем і фармулявання іх у выглядзе задачы, абдумвання і рашэння сітуацыі, кампаноўкі матэрыялаў у цэласную сістэму.

Такім чынам, у працэсе навучання важным метадам з'яўляецца працэс уцягвання студэнта ў сумесную творчую дзейнасць з педагогам. Акцэнт пераносіцца на арганізацыйна-карэкцыйную працу, у якой педагогу неабходна стымуляваць пазнавальны інтарэс студэнтаў. Гэта магчыма пры дапамозе ініцыіравання пытанняў і жаданні навучэнцаў знайсці адказы самастойна.

Станоўчы эмацыянальны фон дзейнасці ствараюць займальныя формы ў выглядзе гульняў-практыкаванняў, спаборніцтваў, конкурсаў на хуткі пошук памылак. Выкарыстоўваюцца таксама "сігнальныя карткі", сюжэтна-дыдактычныя гульні, апорныя сігнальныя канспекты і інш. Яны



БИБЛИОТЕКА БГУКИ

робяць працэс авалодвання ведамі больш прывабным, фарміруюць устойлівую станоўчую матывацыю да самастойнай работы.

Сёння педагог перастае быць манапалістам у галіне ведаў. Кнігі і словы педагога замяняюць такія формы інфармацыі, як камп'ютэр, відэазапіс, тэлебачанне. Слова выцясняецца вобразам. Таму важным метадам, стымулюючым пазнавальную актыўнасць студэнтаў, з'яўляецца выкарыстанне модульнай аўдыёвізуальнай тэхналогіі, якая дапаўняе вербальны метад педагагічнага ўздзеяння. Гэты метад накіраваны на выкарыстанне ўсіх відаў памяці пры ўспрыманні вучэбнага матэрыялу. Ён умацоўвае пазнавальную актыўнасць, дзякуючы стымуляцыі эмацыянальных працэсаў і выкарыстання разнастайных механізмаў разумовай дзейнасці.

Тым не менш асоба педагога застаецца важным фактарам, стымулюючым пазнавальную дзейнасць студэнтаў. Прыклад паводзін педагога фарміруе асобу студэнта ў большай меры, чым рознага кшталту тлумачэнні. Педагогу неабходна ўменне на проста паказаць важнасць ведаў і ўменняў у прафесійнай дзейнасці, але і каштоўнасць самаразвіцця ў працэсе самастойнай работы.

Яркасць, маляўнічасць, эмацыянальнасць вывучаемага матэрыялу дапамагаюць лягчэй зразумець яго сутнасць. Сутыкненне з невядомым і малазразумелым матэрыялам прымушае студэнта больш дэталёва перагледзець свой кагнітыўны ўзровень.

Адказваючы на пытанне: "Як, на Ваш погляд, можна актывізаваць самастойную дзейнасць студэнтаў?" — з 49 апытаных 7 адказалі: "зацікавіць і заінтрыгаваць выкладаннем", 9 чалавек — "зносінамі з разумным і цікавым выкладчыкам", 4 — "захапляючай інфармацыяй", 4 — "жаданнем студэнта не выглядаць невукам у вачах сакурснікаў", 20 — "праз такія

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

формы, як алімпіяды, творчыя вечары, дыспуты, канферэнцыі, круглыя сталы".

Пазнавальны інтарэс як вядучы матыў самастойнай дзейнасці студэнтаў з'яўляецца важнай часткай творча-пераўтваральнай, духоўнай дзейнасці чалавека. Уменне перакanструяваць, перапрацаваць інфармацыю актывізуе пазнавальную актыўнасць. Саперніцтва, супрацоўніцтва і сатворчасць студэнтаў паміж сабой і з педагогам — важныя спосабы, актывізуючыя пазнавальны працэс.

Атмасфера інтэлектуальнага паядынку лёгка ствараецца ў працэсе правядзення сюжэтна-дыдактычнай гульні "Экзамен". Гэта своеасаблівы трэнінг. Творчасць педагога ў час правядзення гульні стымулюе і творчасць студэнтаў. У гэтым сутнасць спосабу ўключэння іх у самастойны творчы працэс.

Разнастайныя формы і спосабы кантролю таксама дазваляюць актывізаваць самастойную работу студэнтаў. Гэта магчыма, калі ў працэсе вывучэння ўсяго курса педагог абгрунтоўвае крытэрыі, па якіх яна будзе ацэньвацца.

Эфектыўнасць выканання самастойных заданняў можна вызначыць па наступных крытэрыях:

— патрэбнасна-матывацыйным: імкненне студэнта займацца самастойнай работай, уменне ставіць праблемныя задачы і знаходзіць на іх адказы;

— інтэлектуальным: валоданне матэрыялам курса, уменне аперыраваць паняццямі на экзамене ці заліку, напісанне курсавой работы і інш.;

— дзейнасна-практычным: колькасць і характар пытанняў, якія студэнты задаюць педагогу, каб удасканаліць і спрагназіраваць кірункі і шляхі самастойнага пошуку;

— эмацыянальным: адэкватнасць рэакцый студэнтаў у адказ на атрыманыя ад педагога заданні і іншыя формы самастойнай работы, выяўленне станоўчых і адмоўных эмоцый;

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

— валявым: імкненне завяршыць заданне, выканаць увесь комплекс задач самастойна, ініцыятыўна і адказна.

Выкарыстоўваючы названыя крытэрыі, педагог імкнецца дасягнуць таго, каб пазнавальны інтарэс стаў устойлівай якасцю асобы. Элементы даследавання і творчасці ў працэсе здабывання ведаў, дыялагічнасць і сатворчасць суб'ектаў адукацыйнага працэсу стымулююць самастойны пошук. Прафесійны і асобасны рост студэнта для педагога з'яўляецца важнай умовай і ўласнай самарэалізацыі.

Л.Талстой пісаў аб тым, што дзейнасць таго, хто навучае, як і дзейнасць таго, хто навучаецца, маюць адну мэту. Задача адукацыі — толькі вывучэнне ўмоў супадзення гэтых двух імкненняў у дасягненні адной мэты.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ